## ДУБНОЎСКІЯ ЧЫТАННІ

Саюз беларускіх грамадскіх аб'яднанняў і абшчын (старшыня Л.М.Левін), Магілёўская яўрэйская абшчына (старшыня У.Г.Шэлектар), грамадскае аб'яднанне «Рэспубліканскі фонд «Халакост» пры падтрымцы Амерыканскага аб'яднанага размеркавальнага камітэта «Джойнт» арганізавалі і правялі 17—19 кастрычніка 2000 г. у г.Магілёве II Міжнародны абшчынны фестываль яўрэйскай кнігі ў Беларусі, у рамках якога адбыліся Дубноўскія чытанні «Спадчына Сямёна Дубнова і вывучэнне гісторыі яўрэяў у дзяржавах СНД і Балтыі», прысвечаныя 140-годдзю з дня нараджэння яўрэйскага гісторыка, публіцыста, грамадскага дзеяча.

Дубноў Сямён Маркавіч нарадзіўся ў 1860 г. у мястэчку Мсціслаўе Магілёўскай вобласці. У 1906 г. пераехаў у Пецярбург, дзе пачаў з 1908 г. выкладаць яўрэйскую гісторыю на курсах усходазнаўства. З 1908 па 1918 гг. з'яўляўся рэдактарам журнала «Яўрэйская гісторыя».

У 1922 г. пераехаў у Германію, у 1933 г. — у Рыгу. Пасля акупацыі Рыгі нямецкімі войскамі С.Дубноў быў арыштаваны, загнаны ў гета, дзе вёў дзённік і працягваў навуковыя даследаванні. У студзені 1941 г. яго ўключылі ў калону смертнікаў. Дакладны тэрмін і месца гібелі С.Дубнова невядомы.

У адным з першых гістарычных твораў «Што такое яўрэйства?» С.Дубноў прадставіў гісторыю яўрэйскага народа. Ім напісаны «Падручнік яўрэйскага народа», «Сусветная гісторыя яўрэйскага народа» (10 тамоў). Найбольш поўна С.Дубноў выказаў свае погляды на яўрэйства, яго патрэбы ў цыкле артыкулаў «Пісьмы аб старым і новым яўрэйстве».

Багаты матэрыял аб жыцці і дзейнасці С.Дубнова, яго эпохі надрукаваны ва ўспамінах «Кніга майго жыцця».

На Дубноўскіх чытаннях прагучалі даклады і паведамленні вучоных і краяведаў з краін СНД і Балтыі: «С.Дубноў і Беларусь: эвалюцыя адносін да нацыянальнай тра-

дыцыі» (І.Герасімава, г.Мінск), «Сямён Дубноў і руская філасофская традыцыя» (А.Семанаў, г.Санкт-Пецярбург), «Актуальнасць канцэпцыі яўрэйства як духоўнай і культурна-гістарычнай нацыі» (А.Глоба, г.Данецк), «Дакументы Сямёна Дубнова ў архіўных фондах яўрэйскіх вучоных Пецярбурга» (В.Гесэн, г.Санкт-Пецярбург), «С.Дубноў у Адэсе» (А.Місюк, г.Адэса), «С.Дубноў у Вільні» (Ю.Гурвічус, г.Вільнюс), «Яўрэі-журналісты ў Беларусі ў першай палове XIX ст.» (А.Падліпскі, г.Віцебск), «С.Дубноў і яго сям'я» (В.Дубнова, г.Масква), «Крывавы навет» і магія ў XIX ст. (па матэрыялах Нацыянальнага архіва Беларусі ў г.Гродна)» (В.Сабалеўская, г.Гродна), «Свет яўрэйскіх мястэчак Беларусі ўчора і сёння. Праблемы вывучэння» (Н.Мяцельская, г.Мінск), «Заняткі яўрэйскага насельніцтва Магілёўскай губерніі ў канцы XIX ст. (па матэрыялах перапісу насельніцтва Расіі 1897 г.)» (В.Каленікава, г.Магілёў), «Вобраз яўрэя ў пісьмовых сярэднявечных беларускіх крыніцах» (І.Марзалюк), «Яўрэі Магілёўскай губерніі на выбарах у органы самакіравання ў 1917 г.» (А.Вараб'ёў, г.Мінск), «Аб вывучэнні віцебскага перыяду жыцця мастака І.Цадкіна» (А.Лісаў, Віцебск), «Антысемітызм на Гомельшчыне. 20-я гады XX стагоддзя» (Н.Мінава, г.Гомель), «Яўрэйская адукацыя на Гомельшчыне ў 20-я гг. XX ст.» (Г.Засінец, г.Гомель). Падчас канферэнцыі было праведзена пасяджэнне «круглага стала» на тэму «Праблемы вывучэння і выкладання гісторыі яўрэяў у краінах СНД».

На думку вучоных, чытанні далі пачатак глыбокаму вывучэнню спадчыны С.Дубнова, аб'яднанню краязнаўцаў, гісторыкаў, якія развіваюць яго вучэнне ў сваіх работах. Былі ўнесены прапановы аб стварэнні міжнароднай грамадскай арганізацыі імя С.Дубнова і адпаведнага фонду для забеспячэння функцыянавання арганізацыі.

Актыўны ўдзел у арганізацыі вышэйазначаных мерапрыемстваў прыняла Магілёўская яўрэйская абшчына, якая налічвае 3,5 тыс. чалавек і ў сакавіку 2000 г. адзначыла 10-годдзе з дня заснавання. Рашэннем Магілёўскага гарвыканкома для абшчыны выдзелена асобнае памяшканне. Пры ёй дзейнічаюць сямейны і жаночы клубы,

маладзёжнае аддзяленне абшчыны, савет ветэранаў вайны, адна з лепшых у Беларусі яўрэйская нядзельная школа. Дабрачынная арганізацыя абшчыны аказвае дапамогу 1,5 тыс. пенсіянераў, хворых; арганізоўвае летні адпачынак для дзяцей. Мастацкія калектывы абшчыны прынялі актыўны ўдзел у мерапрыемствах III Усебеларускага фестывалю нацыянальных культур у г.Гродна.

*А.Бабіцкі, вядучы спецыяліст аддзела*
*ўстаноў культуры і народнай творчасці*
*Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь*